# РЭКАМЕНДАЦЫІ

# ПА ВЫКАНАННЮ ПАЛАЖЭНІЙ ДАРОЖНАЙ КАРТЫ РЭФАРМАВАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Рэкамендацыі падтрыманы ўдзельнікамі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Грамадскі ўдзел у мадэрнізацыі вышэйшай школы: роля грамадзянскай супольнасці ў імплементацыі Дарожнай карты рэфармавання вышэйшай адукацыі Беларусі», Мінск, 23-24 верасня 2016*

## Змест

**Уводзіны. Дарожная карта рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі** ............ 3

**1. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты трансфармацыі архітэктуры вышэйшай адукацыі, распрацоўцы Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў (НРК) і інструментаў забеспячэння празрыстасці (дадаткі да дыпломаў аб вышэйшай адукацыі)** ........................................ 4

**2. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты па забеспячэнні кантролю якасці вышэйшай адукацыі**........................................ 12

**3. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты па развіцці акадэмічнай мабільнасці і інтэрнацыяналізацыі** ........................................ 15

**4. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты па развіцці неперарыўнай адукацыі і па пытаннях сацыяльнага вымярэння вышэйшай адукацыі** ................................ 18

**5. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты, накіраваных на забеспячэнне выканання фундаментальных акадэмічных каштоўнасцяў** ........................... 24

## Уводзіны. Дарожная карта рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі

У траўні 2015 г. канферэнцыя міністраў адукацыі Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕПВА) у Ерэване прыняла рашэнне аб задавальненні заяўкі Рэспублікі Беларусь пра ўступленне ў Балонскі працэс. Разам з тым удзельнікі канферэнцыі адзначылі, што па шэрагу параметраў сістэма вышэйшай школы ў Беларусі не ў поўнай ступені адпавядае крытэрам Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі. У сувязі з гэтым была распрацавана Дарожная карта рэфармавання вышэйшай адукацыі. Рэспубліка Беларусь прыняла на сябе абавязкі па яе выкананні да 2018 г.

Дарожная карта не прадугледжвае кардынальнай ломкі сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Яе мэта - удасканаленне нацыянальнай вышэйшай школы за кошт укаранення перадавых дасягненняў і міжнародных стандартаў у сферы арганізацыйнай структуры, метадаў кіравання, сувязі з рынкам працы, міжнароднага супрацоўніцтва і многіх іншых аспектаў функцыянавання. Выкананне палажэнняў Дарожнай карты дазволіць сістэме вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь паспяхова адаптавацца да пераменаў, якія адбываюцца ў сучасным свеце, заняць годнае месца на міжнародным рынку адукацыйных паслуг.

Эксперты Грамадскага Балонскага камітэта прапануюць разгорнутыя рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты. Яны заснаваныя на маніторынгу працэсаў, якія адбываюцца ў сістэме вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь, а таксама глыбокіх ведах тэндэнцыяў развіцця вышэйшай адукацыі ў рамках ЕПВА і сучасным свеце. Рэкамендацыі структураваныя ў адпаведнасці з раздзеламі Дарожнай карты і змяшчаюць канкрэтныя прапановы па ўнясенні змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

## 1. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты трансфармацыі архітэктуры вышэйшай адукацыі, распрацоўцы Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў (НРК) і інструментаў забеспячэння празрыстасці (дадаткі да дыпломаў аб вышэйшай адукацыі)

Дарожная карта рэфармавання вышэйшай адукацыі ўключае ў сябе наступныя палажэнні адносна архітэктуры вышэйшай школы, Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў (НРК), інструментаў забеспячэння празрыстасці (дадаткі да дыпломаў аб вышэйшай адукацыі).

У адносінах да сістэмы кваліфікацыяў:

1) абавязкі па распрацоўцы Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў, якая адпавядае Сістэме кваліфікацыяў у ЕПВА (QF-EHEA);

2) абавязкі па вызначэнні графіка гэтай працы і стварэнні нацыянальнай каардынацыйнай групы да канца 2015 г. і па забеспячэнні пачатку працы над НРК у першай палове 2016 г.;

3) у рамках дадзенай дзейнасці абавязкі па ўвядзенні трохузроўневай сістэмы ў адпаведнасці з ўзгодненай балонскай мадэллю, па ўвядзенні першай ступені, якая ўключае 180-240 заліковых адзінак (крэдытаў) Еўрапейскай сістэмы перакладных заліковых адзінак (ECTS), і па адпаведным паэтапным згортванні існуючай 5-гадовай ступені бакалаўра і, як следства, па вымярэнні навучальнай нагрузкі студэнтаў у заліковых адзінках (ECTS) згодна з вызначэннямі перагледжанага Кіраўніцтва карыстальнікаў ECTS (ECTS Users' Guide).

Па інструментах забеспячэння празрыстасці:

1) абавязкі па распрацоўцы да канца 2015 г. плана імплементацыі ECTS у адпаведнасці з перагледжаным Кіраўніцтвам карыстальнікаў (ECTS Users' Guide) і з улікам прыярытэтнасці вынікаў навучання (learning outcomes), структуры навучальных планаў, іх рэалізацыі, ацэнкі і прымянення для праграм мабільнасці і пачатку яго рэалізацыі да канца 2017 г.;

2) абавязкі па распрацоўцы да канца 2017 г. плана забеспячэння аўтаматычнай бясплатнай выдачы Дадатка да дыплома (Diploma Supplement) у фармаце, распрацаваным Радай Еўропы, Еўрапейскай камісіяй і ЮНЕСКА, на распаўсюджанай мове (акрамя рускай).

Згодна з міжнароднай практыкай, працэдура рэалізацыі распрацоўкі і ўкаранення Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў уключае наступныя 10 крокаў (*The European Higher Education Area in 2015: Bologna process implementation report. European Commission / EACEA / Eurydice, 2015. - 304 p.) – URL http://eacea.ec.europa.eu/education/eurydice/documents/thematic_reports/182EN.pdf):*

1. Рашэнне пачаць распрацоўку прынята нацыянальным органам, адказным за вышэйшую адукацыю.

2. Мэта (-ы) НРК узгодненыя і выкладзеныя.

3. Распачаты працэс распрацоўкі НРК, вызначаны (-я) і створаны (-я) ўпаўнаважаны (-я) орган (-ы) (камітэт (-ы)) сумесна з зацікаўленымі бакамі (стэйкхолдэрамі).

4. Узгодненыя структура ўзроўняў адукацыі, дэскрыптары ўзроўняў (вынікі навучання - LO) і дыяпазоны крэдытаў (ECTS).

5. Праведзеныя кансультацыі / абмеркаванне на нацыянальным узроўні структуры НРК, якая была ўзгоднена з зацікаўленымі бакамі (стэйкхолдэрамі).

6. НРК прынята на заканадаўчым ці іншым аналагічным высокім узроўні.

7. Рэалізацыя НРК пачалася з пагаднення пра размеркаванне ролю і адказнасці вышэйшых навучальных устаноў, агенцтваў забеспячэння якасці (IES) і іншых органаў.

8. Адукацыйныя праграмы перагледжаныя на аснове вынікаў навучання (дэскрыптараў LO), уключаных у НРК.

9. Кваліфікацыі ўключаныя ў НРК.

10. НРК сертыфікавана на сумяшчальнасць з сістэмай кваліфікацыяў для Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі.

У мэтах выканання палажэнняў Дарожнай карты трансфармацыі архітэктуры вышэйшай адукацыі, распрацоўкі Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і інструментаў забеспячэння празрыстасці (дадатка да дыпломаў аб вышэйшай адукацыі) прапануецца ўнесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі наступныя змяненні і дапаўненні.

*Артыкул 20. Правы і абавязкі ўстаноў адукацыі*

Дапоўніць пункт 2 артыкула 20:

«2.10. выдаваць дакументы аб вышэйшай адукацыі (дыплом, нацыянальны Дадатак да дыплома, які базуецца на мадэлі, распрацаванай Еўрапейскай камісіяй, Радай Еўропы і ЮНЕСКА / СЕПЕС), узоры якіх самастойна распрацоўваюцца і зацвярджаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі».

РАЗДЗЕЛ XI. ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ

*Артыкул 202. Сістэма вышэйшай адукацыі*

Пункт 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"3. Вышэйшая адукацыя падпадзяляецца на тры ступені і пачатковы ўзровень вышэйшай адукацыі (кароткі цыкл):

пачатковы ўзровень вышэйшай адукацыі (кароткі цыкл);

I ступень - бакалаўрыят;

II ступень - магістратура;

III ступень - адукацыйна-навуковы ўзровень - аспірантура і

навуковы ўзровень - дактарантура».

Пункт 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"4. Пачатковы ўзровень вышэйшай адукацыі (кароткі цыкл) адпавядае пятаму кваліфікацыйнаму ўзроўню Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і прадугледжвае атрыманне асобай агульнакультурнай і прафесійна арыентаванай падрыхтоўкі, спецыяльных уменняў і

ведаў, а таксама пэўнага досведу іх практычнага прымянення з мэтай выканання тыповых задачаў, якія прадугледжаныя для першасных пасадаў у адпаведнай галіне прафесійнай дзейнасці».

Пункт 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«5. I (бакалаўрская) ступень вышэйшай адукацыі адпавядае шостаму кваліфікацыйнаму ўзроўню Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і прадугледжвае атрыманне асобай тэарэтычных ведаў і практычных уменняў і навыкаў, дастатковых для паспяховага выканання прафесійных абавязкаў па абранай спецыяльнасці.

На I ступені вышэйшай адукацыі (у бакалаўрыяце) забяспечваецца падрыхтоўка спецыялістаў, здольных дэманстраваць веды і разуменне ў сваёй вобласці ведаў, прымяняць свае веды і разуменне ў прафесійнай дзейнасці і дзякуючы сфарміраваным кампетэнцыям рашаць праблемы ў рамках прафесійнай вобласці, здольных збіраць інфармацыю і інтэрпрэтаваць яе з улікам адпаведных сацыяльных, навуковых і этычных аспектаў, абменьвацца інфармацыяй, ідэямі і абмяркоўваць праблемы і іх рашэнні як са спецыялістамі, так і з непрафесіяналамі, самастойна развіваць сфарміраваныя ўменні/навыкі для працягу навучання.

Вышэйшая адукацыя I ступені дае права на працяг адукацыі на II ступені вышэйшай адукацыі незалежна ад спецыяльнасці на першай ступені і на працаўладкаванне ў адпаведнасці з атрыманай акадэмічнай кваліфікацыяй».

Дапоўніць артыкул 202 пунктамі 6, 7, 8 наступнага зместу:

"6. II ступень вышэйшай адукацыі (магістратура) адпавядае сёмаму кваліфікацыйнаму ўзроўню Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і прадугледжвае падрыхтоўку спецыялістаў, здольных: дэманстраваць паглыбленыя веды і разуменне, якія грунтуюцца на ўжо набытых на першым цыкле, пашыраць іх, забяспечваючы навізну ў развіцці і прымяненні ідэяў, часта ў рамках даследчага кантэксту; прымяняць свае веды і разуменне, а таксама здольнасці рашаць праблемы ў новых і незнаёмых умовах у рамках шырокага (або мульцідысцыплінарнага) кантэксту; інтэграваць веды і ўмець рашаць праблемы ў комплексе; фармуляваць высновы, валодаючы няпоўнай або абмежаванай інфармацыяй, уключаючы рэфлексію сацыяльнай і этычнай адказнасці пры выкарыстанні ведаў і меркаванняў; выразна і адназначна выкладаць свае высновы і веды, доказна абгрунтоўваючы іх перад аўдыторыяй як спецыялістаў, так і неспецыялістаў; фарміраваць уменні і навыкі да самастойнага і самарэгуляванага далейшага навучання.

На II ступені вышэйшай адукацыі рэалізуюцца адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі II ступені, накіраваная на развіццё навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай працы (даследчая магістратура), і адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі II ступені, накіраваная на развіццё прафесійных і кіраўніцкіх кампетэнцыяў з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста (прафесійная магістратура), якія забяспечваюць атрыманне ступені магістра ў пэўнай галіне навукі або тэхнікі ў адпаведнасці з прафесійным стандартам.

7. Вышэйшая адукацыя таксама можа быць атрымана ў рамках адукацыйных праграм, якія прапануюць інтэграванае навучанне, якое ахоплівае I і II ступені, па найбольш складаных спецыяльнасцях, якія рэгулююцца дзяржавай асобнымі нарматыўнымі прававымі актамі і вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

8. III ступень вышэйшай адукацыі падпадзяляецца на адукацыйна-навуковыя і навуковыя праграмы дадзенай ступені вышэйшай адукацыі.

Адукацыйна-навуковыя праграмы III ступені (аспірантура, ад'юнктура) адпавядаюць восьмаму кваліфікацыйнаму ўзроўню Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і прадугледжваюць атрыманне асобай тэарэтычных ведаў, уменняў, навыкаў і іншых кампетэнцыяў, дастатковых для

выпрацоўкі новых ідэяў, рашэння комплексных праблем у галіне прафесійнай, эксперыментальнай і/або інавацыйнай дзейнасці, авалоданне метадалогіяй навуковай, эксперыментальнай і педагагічнай дзейнасці, а таксама правядзенне ўласнага навуковага даследавання, вынікі якога маюць навуковую навізну, тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Навуковы ўзровень III ступені вышэйшай адукацыі (дактарантура) адпавядае дзевятаму кваліфікацыйнаму ўзроўню Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і прадугледжвае набыццё кампетэнцыяў па распрацоўцы і ўкараненні метадалогіі і методыкі даследчай працы, стварэнні новых сістэмаўтваральных ведаў і/або прагрэсіўных тэхналогіяў, рашэнні важнай навуковай або прыкладной праблемы, якая мае агульнанацыянальнае і/або сусветнае значэнне.

На III ступені вышэйшай адукацыі, якая адпавядае восьмаму і дзевятаму кваліфікацыйным узроўням Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў, забяспечваецца падрыхтоўка спецыялістаў, здольных: дэманстраваць сістэмнае разуменне ў галіне ведаў, даследчыя ўменні/навыкі і валоданне метадамі навуковых даследаванняў у сваёй навуковай вобласці; **дэманстраваць здольнасць ініцыяваць**, планаваць, ажыццяўляць **і адаптаваць** даследчы працэс, выказваючы сумленнасць навукоўца; сваім арыгінальным даследаваннем рабіць унёсак, пашыраючы межы ведаў і атрымліваючы навуковыя вынікі, вартыя публікацый на нацыянальным і міжнародным узроўнях; крытычна аналізаваць, ацэньваць і сінтэзаваць новыя комплексныя ідэі; умець размаўляць як з прадстаўнікамі навуковай супольнасці, так і з прадстаўнікамі шырокай грамадскасці па пытаннях, якія тычацца сваёй навуковай вобласці; прасоўваць у рамках акадэмічнага і прафесійнага кантэкстаў тэхналагічныя, сацыяльныя ці культурныя дасягненні ў грамадства, заснаванае на ведах».

*Артыкул 204. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі*

Артыкул 204 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі падпадзяляюцца на:

1.1. адукацыйную праграму пачатковай вышэйшай адукацыі (кароткі цыкл), якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі/ступені малодшага бакалаўра;

1.2. адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі I ступені (бакалаўрыят), якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі/ступені бакалаўра;

1.3. адукацыйную праграму II ступені (магістратуру), якая забяспечвае атрыманне ступені магістра;

1.4. адукацыйную праграму вышэйшай адукацыі інтэграванага навучання, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста/магістра па найбольш складаных спецыяльнасцях, якія рэгулююцца дзяржавай асобнымі нарматыўнымі прававаымі актамі і вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь;

1.5. адукацыйную праграму III ступені вышэйшай адукацыі, якая ўключае адукацыйна-навуковую і навуковую праграму і забяспечвае атрыманне навуковай ступені кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) і доктара навук. Адукацыйныя праграмы III ступені вышэйшай адукацыі падпадзяляюцца на:

1.5.1. адукацыйна-навуковую праграму аспірантуры (ад'юнктуры), якая завяршаецца прысваеннем асобе, якая паспяхова скончыла навучанне ў аспірантуры (ад'юнктуры), кваліфікацыі «даследчык», а пасля абароны кваліфікацыйнай працы (дысертацыі на атрыманне навуковай ступені кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD)) - навуковай ступені кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD);

1.5.2. навуковую праграму дактарантуры, якая завяршаецца прысваеннем асобе, якая паспяхова скончыла дактарантуру, пасля абароны кваліфікацыйнай працы (дысертацыі на атрыманне навуковай ступені доктара навук) - навуковай ступені доктара навук".

Дапоўніць артыкул 204 пунктамі 2, 3, 4, 5, 6 наступнага зместу:

"2. Атрыманне вышэйшай адукацыі на кожнай ступені вышэйшай адукацыі прадугледжвае паспяховае выкананне асобай, якая навучаецца, адпаведнай адукацыйнай (адукацыйна-прафесійнай або адукацыйна-навуковай) або навуковай праграмы і з'яўляецца падставай для прысуджэння адпаведнай ступені вышэйшай адукацыі:

1) малодшы бакалаўр;

2) бакалаўр;

3) магістр;

4) кандыдат навук (доктар філасофіі - PhD);

5) доктар навук.

2.1. Малодшы бакалаўр - гэта адукацыйна-прафесійная ступень, якая набываецца на пачатковым ўзроўні вышэйшай адукацыі (кароткім цыкле) і прысуджаецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў выніку паспяховага выканання асобай, якая навучаецца, адукацыйнай прафесійнай праграмы вышэйшай адукацыі, аб'ём якой складае 90-120 крэдытаў.

Асоба, якая навучаецца, мае права атрымаць ступень малодшага бакалаўра пры ўмове наяўнасці ў яго/яе поўнай агульнай сярэдняй адукацыі.

2.2. Бакалаўр - гэта адукацыйная ступень, якая набываецца на I ступені вышэйшай адукацыі і прысуджаецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў выніку паспяховага выканання асобай, якая навучаецца, адукацыйна-прафесійнай праграмы, аб'ём якой складае 180 *) -240 крэдытаў.

*) Пры 12-гадовай агульнай сярэдняй адукацыі

Аб'ём адукацыйна-прафесійнай праграмы для атрымання ступені бакалаўра на аснове ступені малодшага бакалаўра вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

Асоба, якая навучаецца, мае права атрымаць ступень бакалаўра пры ўмове наяўнасці ў яго/яе поўнай агульнай сярэдняй адукацыі.

2.3. Магістр - гэта адукацыйная ступень, якая набываецца на II ступені вышэйшай адукацыі і прысуджаецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў выніку паспяховага выканання асобай, якая навучаецца, адпаведнай адукацыйнай праграмы.

Ступень магістра набываецца па адукацыйна-прафесійнай або адукацыйна-навуковай праграме. Аб'ём адукацыйна-прафесійнай праграмы падрыхтоўкі магістра складае 90-120 крэдытаў, аб'ём адукацыйна-навуковай праграмы - 120 крэдытаў.

Адукацыйна-прафесійная праграма магістра абавязкова ўключае прыкладную (вытворчую) кампаненту ў аб'ёме не менш за 50%.

Адукацыйна-навуковая праграма магістра абавязкова ўключае даследчую (навуковую) кампаненту ў аб'ёме не менш за 50%.

Асоба, якая навучаецца, мае права атрымаць ступень магістра пры ўмове наяўнасці ў яго/яе ступені бакалаўра.

2.4. Ступень/кваліфікацыя «даследчык» - гэта адукацыйна-навуковая кваліфікацыя, якая набываецца на III ступені вышэйшай адукацыі на аснове ступені магістра і прысвойваецца па завяршэнні навучання ў аспірантуры (ад'юнктуры).

2.5. Кандыдат навук (доктар філасофіі - PhD) - гэта адукацыйная і адначасова першая навуковая ступень, якая набываецца на III ступені вышэйшай адукацыі (аспірантура, ад'юнктура) на аснове ступені магістра.

Ступень кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) прысуджаецца спецыялізаванай Радай па абароне дысертацыяў адпаведнай установы вышэйшай адукацыі або навуковай установы ў выніку паспяховага выканання аспірантам (ад'юнктам) адпаведнай адукацыйна-навуковай праграмы і публічнай абароны дысертацыі ў спецыялізаванай Радзе па абароне дысертацыяў.

Асоба, якая навучаецца, можа атрымаць ступень кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) падчас вучобы ў аспірантуры (ад'юнктуры) на дзённай або завочнай форме навучання.

Асобы, якія прафесійна ажыццяўляюць навуковую, навукова-тэхнічную і навукова-педагагічную дзейнасць па асноўным месцы працы, могуць атрымаць ступень кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) па-за аспірантурай, у прыватнасці, падчас знаходжання ў творчым адпачынку, пры ўмове паспяховага выканання адпаведнай адукацыйна-навуковай праграмы і публічнай абароны дысертацыі ў спецыялізаванай Радзе па абароне дысертацыяў.

Нарматыўны тэрмін падрыхтоўкі кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) у аспірантуры (ад'юнктуры) складае па дзённай форме навучання - тры гады, па завочнай форме і суіскальніцтве - чатыры гады. Аб'ём адукацыйнага складніка адукацыйна-навуковай праграмы падрыхтоўкі кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) складае 30-60 крэдытаў.

Навуковыя ўстановы могуць ажыццяўляць падрыхтоўку кандыдатаў навук (дактароў філасофіі - PhD) па ўласнай адукацыйна-навуковай праграме згодна з атрыманай ліцэнзіяй на адпаведную адукацыйную дзейнасць. Навуковыя ўстановы могуць таксама ажыццяўляць падрыхтоўку кандыдатаў навук (дактароў філасофіі - PhD) па адукацыйна-навуковай праграме, узгодненай з установай вышэйшай адукацыі. У такім выпадку навуковы складнік гэтай праграмы выпрацоўваецца ў навуковай установе, а адукацыйны складнік - ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

2.6. Доктар навук - гэта другая навуковая ступень, якая набываецца асобай, якая навучаецца, на навуковым узроўні III ступені вышэйшай адукацыі на аснове ступені кандыдата навук (доктара філасофіі - PhD) і якая прадугледжвае наяўнасць вельмі высокіх кампетэнцыяў у галіне распрацоўкі і ўкаранення метадалогіі даследчай працы, правядзення арыгінальных даследаванняў, атрымання навуковых вынікаў, якія забяспечваюць рашэнне важных тэарэтычных і/або прыкладных праблем, якія спрыяюць інавацыйнаму развіццю грамадства, маюць агульнанацыянальнае і/або сусветнае значэнне і апублікаваныя ў міжнародных навуковых выданнях, якія рэцэнзуюцца.

Ступень доктара навук прысуджаецца спецыялізаванай Радай па абароне дысертацыяў установы вышэйшай адукацыі або навуковай установы па выніках публічнай абароны навуковых дасягненняў у выглядзе дысертацыі або апублікаванай манаграфіі альбо па сукупнасці артыкулаў, апублікаваных у айчынных і міжнародных прафесійных выданнях, якія рэцэнзуюцца і пералік якіх зацвярджаецца цэнтральным органам выканаўчай улады ў сферы адукацыі і навукі.

3. Адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі рэалізуюцца ў вочнай, уключаючы вячэрнюю для працуючых асобаў, якіх навучаюцца, завочнай і дыстанцыйнай (электроннай) формах атрымання адукацыі альбо ў выглядзе нефармальнага або інфармальнага (спантанага) навучання, а таксама могуць рэалізоўвацца з дапамогай сеткавай формы атрымання адукацыі.

4. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм установай вышэйшай адукацыі ўжываецца форма арганізацыі адукацыйнай дзейнасці, заснаваная на кампетэнтнасным падыходзе і модульным прынцыпе прадстаўлення зместу адукацыйнай праграмы і складання навучальных планаў, выкарыстанні адпаведных адукацыйных тэхналогіяў.

5. Для вызначэння структуры адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі і працаёмкасці іх асваення прымяняецца сістэма заліковых адзінак (крэдытаў).

Крэдыт (заліковая адзінка) уяўляе сабой уніфікаваную адзінку вымярэння працаёмкасці навуковай нагрузкі асобы, якая навучаецца. Заліковымі адзінкамі вымяраюцца вынікі навучання студэнта і час працы, які ўключае ў сябе ўсе віды яго навучальнай дзейнасці, прадугледжаныя навучальным планам (у тым ліку, аўдыторную і самастойную працу), практыку.

Працаёмкасць, адпаведная адной заліковай адзінцы, вызначаецца як вывучэнне, якое завяршаецца курсавым іспытам, на працягу аднаго семестра дысцыпліны сярэдняй складанасці, якая патрабуе для засваення на ўзроўні набыцця прадугледжаных стандартам кампетэнцыяў 30 гадзін усіх відаў аўдыторных заняткаў і пры долі аўдыторнай працы, якая не перавышае 10 гадзін.

6. Колькасць крэдытаў (заліковых адзінак) па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі па канкрэтнай спецыяльнасці або кірунку падрыхтоўкі ўсталёўваецца адпаведным адукацыйным стандартам».

*Артыкул 205. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі*)*

Артыкул 205 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Адукацыйныя стандарты дзейнічаюць да распрацоўкі і ўвядзення ў дзеянне Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў і прафесійных стандартаў у поўным аб'ёме і замяняюцца на прафесійныя.

2. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі распрацоўваюцца на аснове прафесійных стандартаў і Нацыянальнай рамкі кваліфікацыяў (пры іх наяўнасці) па кожнай спецыяльнасці, вызначаюць мэты адукацыі, узгадняюць патрабаванні да адукацыі, якія прад'яўляюцца грамадствам і дзяржавай, і ўключаюць сукупнасць патрабаванняў да вынікаў асваення адукацыйных праграм у тэрмінах кампетэнцыяў, да структуры і ўмоў рэалізацыі адукацыйных праграм, якія забяспечваюць неабходнае асобаснае і прафесійнае развіццё, у тым ліку кадравых, фінансавых, матэрыяльна-тэхнічных і іншых умоваў. Адукацыйныя стандарты з'яўляюцца асновай аб'ектыўнай ацэнкі ўзроўню адукацыі і кваліфікацыі выпускнікоў незалежна ад форм атрымання адукацыі.

3. Звычайны аб'ём дзённай формы навучання за адзін год складае 60 крэдытаў, але не менш за 45 крэдытаў. Аб'ём завочнай формы навучання, у тым ліку і дыстанцыйнай, за адзін год павінен складаць не больш за 45 крэдытаў, а агульная працягласць навучання ў гэтай форме не павінна больш чым у паўтары разы перавышаць навучанне ў вочнай форме пры ўжыванні да яе нормы ў 60 крэдытаў.

4. Працаёмкасць праграмы пачатковай вышэйшай адукацыі (кароткага цыклу) складае 90 *) - 120 крэдытаў.

5. Працаёмкасць праграмы навучання I ступені навучання складае не менш за 180 *) і не больш за 240 крэдытаў.

*) Пры 12-гадовай агульнай сярэдняй адукацыі.

6. Працаёмкасць праграмы навучання ў магістратуры складае не менш за 90 і не больш за 120 крэдытаў.

7. Працаёмкасць праграмы інтэграванага навучання складае не менш за 300 і не больш за 360 крэдытаў. Першая частка праграмы неперарыўнага курса навучання (240 крэдытаў) можа адносіцца да навучання I ступені, а астатняя частка можа адносіцца да навучання II ступені.

8. Працаёмкасць навучальнай праграмы аспірантуры (дактарантуры) - 180 крэдытаў, з якіх не менш за 150 крэдытаў складае навукова-даследчая кампанента.

9. Стандарт вышэйшай адукацыі можа ўтрымліваць іншыя звесткі, неабходныя для нарміравання асаблівасцяў асобнай спецыяльнасці вышэйшай адукацыі.

10. Распрацоўку адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі арганізуе Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляе яе сумесна з навучальна-метадычнымі аб'яднаннямі ў сферы вышэйшай адукацыі і арганізацыямі - замоўцамі кадраў і іншымі сацыяльнымі партнёрамі вышэйшай адукацыі.

11. Адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам працы Рэспублікі Беларусь, зацікаўленымі органамі дзяржаўнага кіравання, нацыянальным грамадскім аб'яднаннем студэнтаў, зацікаўленымі нацыянальнымі аб'яднаннямі працадаўцаў».

*Артыкул 206. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі*

Артыкул 206 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі на аснове працаёмкасці адукацыйнай праграмы, усталяванай адпаведным стандартам вышэйшай адукацыі.

2. Тэрмін атрымання пачатковай вышэйшай адукацыі (кароткі цыкл) складае ад года з паловай да двух гадоў.

3. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі I ступені (бакалаўрыят) для асобаў, якія маюць скончаную сярэднюю прафесійную, пачатковую вышэйшую (кароткі цыкл) або вышэйшую адукацыю, усталёўваецца з улікам пацверджаных перыядаў іх навучання і вывучаных імі раней навучальных дысцыплін і практык, прызнаных ў парадку, усталяваным дадзеным Кодэксам або міжнародным пагадненнем, бокам якога з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

4. Тэрмін навучання ў магістратуры для асобаў, якія маюць вышэйшую адукацыю I ступені працаёмкасцю не менш за 300 заліковых адзінак (крэдытаў) або якія раней атрымалі вышэйшую адукацыю II ступені, усталёўваецца з улікам пацверджаных перыядаў іх навучання і вывучаных імі раней навучальных дысцыплін і практык, прызнаных ў парадку, усталяваным дадзеным Кодэксам або міжнародным пагадненнем, бокам якога з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

5. Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі III ступені складае: у дзённай форме атрымання адукацыі - не больш за тры гады; у завочнай форме атрымання адукацыі - не больш за чатыры гады; у форме суіскальніцтва - не больш за пяць гадоў».

## 2. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты па забеспячэнні кантролю якасці вышэйшай адукацыі

У Дарожнай карце адзначаецца, што ў цяперашні час статус адказнага за дадзеныя пытанні органа ў Рэспубліцы Беларусь не адпавядае прынцыпам Балонскага працэсу. Для выпраўлення становішча прадугледжаныя наступныя крокі:

1. Распрацоўка да канца 2017 г. прававой базы для стварэння незалежнага агенцтва кантролю якасці ў адпаведнасці з Еўрапейскімі стандартамі і кіраўніцтвамі (European Standards and Guidelines - ESG).

2. Падрыхтоўка да канца 2015 г. графіка работ па стварэнні такога агенцтва.

3. Запрашэнне праз BFUG замежных экспертаў па кантролю якасці для дапамогі як у распрацоўцы графіка і планаў, так і ў стварэнні самога агенцтва.

У мэтах выканання палажэнняў Дарожнай карты па забеспячэнні якасці вышэйшай адукацыі прапануецца ўнесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі наступныя змяненні і дапаўненні.

*Артыкул 20*

Дапоўніць пункт 2.8:

«фарміраваць сістэму забеспячэння якасці адукацыі».

*Артыкул 23*

Дапоўніць пункт 3:

«аддзел (сектар) якасці».

*Артыкул 29*

Выкласці пункт 1 у наступнай рэдакцыі:

«1. Дзяржаўная акрэдытацыя ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, якой у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) - дзейнасць упаўнаважаных у адпаведнасці з заканадаўствам органаў па ўсталяванні адпаведнасці адукацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі (іншай арганізацыі, якой у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) заканадаўству аб адукацыі, зместу і якасці адукацыі, якая прапаноўваецца, патрабаванням адукацыйных стандартаў, навучальна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, патрабаванням удзельнікаў адукацыйнага працэсу і іншых зацікаўленых асобаў і арганізацыяў, эфектыўнасці працы прынятай сістэмы забеспячэння якасці.

Органамі, упаўнаважанымі праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю, могуць быць акрэдытаваныя для такой дзейнасці юрыдычныя асобы, незалежна ад формы ўласнасці і нацыянальнай прыналежнасці, непадкантрольныя органам кіравання адукацыяй і ўстановаў адукацыі (іншых арганізацыяў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) у іх вобласці акрэдытацыі».

*Артыкул 105*

Дапоўніць п. 3.4:

«забеспячэнне якасці адукацыі».

*Артыкул 109*

Выкласці пункт 7 часткі першай у наступнай рэдакцыі:

«Усталёўвае патрабаванні да сістэм забеспячэння якасці ва ўстановах адукацыі (іншых арганізацыях, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць), да ўзроўня якасці адукацыі і метадам яго ацэнкі. Ажыццяўляе кантроль дзейнасці органаў, упаўнаважаных праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю ўстановаў адукацыі (іншых арганізацыяў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць)".

*Артыкул 118*

Дапоўніць пункт 4:

«Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі вядзецца на аснове прынцыпаў, прынятых у Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі».

Глава 13

Главу 13 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ

Артыкул 124. Арганізацыя забеспячэння якасці адукацыі

1. Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ўсталёўвае правілы і працэдуры і праводзіць ліцэнзаванне на права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, усталёўвае перыядычнасць і асноўныя патрабаванні да акрэдытацыі ўстановаў адукацыі (іншых арганізацыяў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць).

2. Рада Міністраў Рэспублікі Беларусь арганізуе акрэдытацыю і вядзенне ўліку органаў, упаўнаважаных праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю ў Рэспубліцы Беларусь, вызначае парадак і правілы прыцягнення замежных арганізацыяў і прызнання вынікаў праведзеных імі акрэдытацыяў, усталёўвае адзіную форму сертыфіката аб акрэдытацыі.

3. Органы, упаўнаважаныя праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю, на падставе нарматываў забеспячэння навучальнага працэсу, патрабаванняў адукацыйных стандартаў, крытэраў і метадаў ацэнкі адпаведнасці навучальнага працэсу патрабаванням адукацыйных стандартаў і навучальна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм распрацоўваюць палажэнні і працэдуры правядзення акрэдытацыі ўстановаў адукацыі (іншых арганізацыяў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць).

Пры акрэдытацыі ўстановаў вышэйшай адукацыі яны кіруюцца прынцыпамі, прынятымі ў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, у тым ліку шляхам прыцягнення прадстаўнікоў асобаў, якія навучаюцца, і арганізацыяў-спажыўцоў выпускнікоў.

4. Органы, упаўнаважаныя праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю, маюць права запрашаць замежных экспертаў, удзельнічаць у міжнародных сетках і рэгістрах аналагічных органаў.

5. Органы, упаўнаважаныя праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю, абавязаныя публікаваць справаздачы пра сваю дзейнасць.

6. Органы, упаўнаважаныя праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю, абавязаныя мець ўнутраную сістэму кантролю якасці, якая падлягае праверцы арганізацыяй акрэдытацыі адзін раз на пяць гадоў.

Артыкул 125. Забеспячэнне якасці ва ўстановах адукацыі

1. Установы адукацыі (іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) абавязаныя мець ўнутраную сістэму забеспячэння якасці.

2. Забеспячэнне якасці ва ўстановах адукацыі ўключае

- сістэму кадравага, матэрыяльна-тэхнічнага, метадычнага і нарматыўнага забеспячэння навучальнага працэсу;

- сістэму працэдур аналізу і кантролю іх адпаведнасці патрабаванням дзеючага заканадаўства;

- сістэму ацэньвання адпаведнасці ўзроўню адукацыі патрабаванням адукацыйных стандартаў.

3. Установы адукацыі (іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) абавязаныя адзін раз на пяць гадоў праходзіць дзяржаўную акрэдытацыю на від установы адукацыі і адукацыйных праграм.

4. Установы адукацыі (іншыя арганізацыі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) маюць права выбіраць для акрэдытацыі орган з ліку ўпаўнаважаных праводзіць дзяржаўную акрэдытацыю.

5. Установа адукацыі (іншая арганізацыя, якой у адпаведнасці з заканадаўствам нададзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) не пазней чым за месяц да пачатку акрэдытацыі публікуе крытычную справаздачу пра самастойна праведзеную праверку якасці адукацыі, уключаючы вынікі навучання, насычанасць і актуальнасць адукацыйных праграм, забеспячэнне атрымання патрэбных кампетэнцыяў ва ўстанове на аснове крытэраў акрэдытацыі».

## 3. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты па развіцці акадэмічнай мабільнасці і інтэрнацыяналізацыі

У Дарожную карту рэфармавання вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь уключана палажэнне пра распрацоўку ў 2015-2016 гг. Плана (нацыянальнай стратэгіі), накіраванага на развіццё мабільнасці навукова-педагагічнага персаналу і студэнтаў і інтэрнацыяналізацыі.

У адпаведнасці з патрабаваннямі Дарожнай карты План (нацыянальная стратэгія) павінен уключаць мерапрыемствы па:

забеспячэнні, развіцці, дыверсіфікацыі міжнароднай мабільнасці выкладчыкаў і студэнтаў, якія прыязджаюць у беларускія ВНУ, а таксама выязджаюць з іх.

У Плане павінны быць пазначаныя:

палажэнні адукацыйнай палітыкі,

заканадаўчыя меры,

неабходныя для павышэння і дыверсіфікацыі акадэмічнай мабільнасці беларускіх выкладчыкаў і студэнтаў у рамках ЕПВА.

У адпаведнасці з Дарожнай картай План павінен уключаць у сябе працэдуру ўнясення змяненняў у існуючую сістэму выдачы дазволаў на паездкі з мэтай падаўжэння тэрмінаў знаходжання выкладчыкаў і студэнтаў у краінах ЕПВА без неабходнасці атрымання дазволу міністэрства. Мяркуецца, што ўнясенне неабходных змяненняў у заканадаўства павінна адбыцца не пазней за сярэдзіну 2017 г.

У мэтах выканання палажэнняў Дарожнай карты па развіцці акадэмічнай мабільнасці і інтэрнацыяналізацыі прапануецца ў главу 12 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ўнесці змяненні і дапаўненні, якія тычацца міжнароднага супрацоўніцтва.

*Артыкул 118*

Артыкул 118 не ўтрымлівае вызначэння мэтаў міжнароднага супрацоўніцтва (замест гэтага пералічаныя яго формы), у ім не ўлічаныя ўсе суб'екты гэтага працэсу.

У сувязі з гэтым пункт 118.1 прапануецца выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Мэтамі міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі з'яўляюцца атрыманне і распаўсюджванне перадавых ведаў у прыярытэтных для Рэспублікі Беларусь сферах, прапанова адукацыйных паслуг замежным грамадзянам. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца ў наступных формах:

- рэалізацыі сумесных праграм у сферы адукацыі і навуковых даследаванняў;

- атрымання адукацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у арганізацыях замежных дзяржаваў, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь;

- навучання, праходжання стажыровак педагагічных работнікаў і персаналу навучальных установаў Рэспублікі Беларусь у арганізацыях замежных дзяржаваў, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь;

- запрашэння для выкладання і правядзення навуковых даследаванняў замежных спецыялістаў у прыярытэтных для Рэспублікі Беларусь сферах навукі і тэхнікі».

Дапоўніць артыкул 118 пунктамі 118.4, 118.5 у наступным выкладанні:

«118.4. У мэтах мадэрнізацыі і прывядзення нацыянальнай сістэмы адукацыі ў адпаведнасць з еўрапейскімі каштоўнасцямі і стандартамі, а таксама з мэтай уключэння ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі ў рамках Балонскага працэсу Міністэрства адукацыі само прымае ўдзел і падтрымлівае ўдзел установаў адукацыі, арганізацыяў, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, асобаў, якія навучаюцца, і педагагічнага персаналу ў праграмах і праектах міжнароднага супрацоўніцтва на рэгіянальным і еўрапейскім узроўнях.

118.5. Урад стварае адмысловы фонд для фінансавання выязной акадэмічнай мабільнасці навучэнцаў і студэнтаў. Штогод Урадам зацвярджаецца колькасць стыпендыяў, якія фінансуюцца з гэтага фонда, для навучання беларускіх студэнтаў у замежных установах вышэйшай адукацыі, якія займаюць высокія месцы ў сусветных рэйтынгах універсітэтаў».

*Артыкул 121*

У сувязі з тым, што ў артыкуле 121 дадзена некарэктнае вызначэнне акадэмічнай мабільнасці як толькі абмену навучэнцамі, выкладчыкамі і г.д., прапануецца выкласці пункт 121.1 у наступнай рэдакцыі:

«Акадэмічная мабільнасць - атрыманне адукацыі, навучанне, праходжанне стажыровак, выкладанне, удзел у навуковых мерапрыемствах навучэнцамі, педагагічнымі работнікамі і персаналам навучальных установаў Рэспублікі Беларусь за мяжой і грамадзян замежных дзяржаваў ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Акадэмічная мабільнасць дасягаецца праз рэалізацыю міжнародных праграм, міжнародных дамоваў Рэспублікі Беларусь, дамоваў, што заключаюцца паміж установай адукацыі Рэспублікі Беларусь (іншай арганізацыяй сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь) і арганізацыяй замежнай дзяржавы (міжнароднай арганізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства).

Акадэмічная мабільнасць можа быць арганізавана шляхам удзелу студэнтаў (навучэнцаў), педагагічных работнікаў, навуковых супрацоўнікаў, творчых работнікаў установы адукацыі ў праграмах індывідуальных грантаў.

Акадэмічная мабільнасць таксама можа ажыццяўляцца па ініцыятыве студэнтаў (навучэнцаў), педагагічных работнікаў, навуковых супрацоўнікаў, творчых работнікаў установы адукацыі.

Падставай для ажыццяўлення ініцыятыўнай акадэмічнай мабільнасці з'яўляецца афіцыйнае запрашэнне ад замежнай адукацыйнай арганізацыі, навуковага цэнтра, іншай арганізацыі або ўстановы».

Пункт 121.3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Асобы, якія навучаюцца, педагагічныя работнікі і персанал навучальных установаў павінны вярнуцца ў дзяржаву пастаяннага пражывання пасля сканчэння навучання, павышэння кваліфікацыі, удасканалення педагагічнай дзейнасці. Працягласць і іншыя ўмовы акадэмічнай мабільнасці ўсталёўваюцца дамовай.

Акадэмічная мабільнасць з'яўляецца неад'емным правам педагагічных работнікаў і навучэнцаў. Не дапускаецца нематываваная адмова ў праве ўдзельнічаць у праграмах акадэмічнага абмену, пакаранне за ўдзел у такіх праграмах або іншае парушэнне законных правоў педагагічных работнікаў і асобаў, якія навучаюцца».

## 4. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты па развіцці неперарыўнай адукацыі і па пытаннях сацыяльнага вымярэння вышэйшай адукацыі

Дарожная карта адзначае неадпаведнасць Балонскім прынцыпам абавязковага размеркавання студэнтаў, якое шырока прымяняецца на практыцы да студэнтаў, чыё навучанне фінансуецца за кошт сродкаў бюджэту. Для выпраўлення становішча Дарожная карта прадугледзела наступныя крокі ў галіне забеспячэння сацыяльнага вымярэння вышэйшай адукацыі: да канца 2016 г. перагледзець абавязкі студэнтаў, чыё навучанне фінансуецца за кошт бюджэту, прымаць размеркаванне на працу пасля выпуска з мэтай абмежавання гэтай практыкі пэўнымі прафесіямі, у дачыненні да якіх у краіне назіраецца істотны незадаволены попыт, з улікам практыкі іншых еўрапейскіх краін.

У мэтах выканання палажэнняў Дарожнай карты па развіцці неперарыўнай адукацыі і па пытаннях сацыяльнага вымярэння вышэйшай адукацыі прапануецца ўнесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі наступныя змяненні і дапаўненні.

*Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе, і іх вызначэнні*

Пункт 2.4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«стварэнне неабходных умоваў для забеспячэння права на адукацыю на працягу ўсяго жыцця ў адпаведнасці з патрэбамі асобы, з адаптаванасцю сістэмы адукацыі да асаблівасцяў развіцця, здольнасцяў і інтарэсаў чалавека, з магчымасцямі дасягнуць самазанятасці, захоўваць працаўладкаванне і здольнасцю перамяшчацца на рынку працы".

Дапаўненне:

«1.23. Сацыяльнае партнёрства - практыка сумеснай выпрацоўкі рашэнняў і збалансаванай адказнасці, якая падзяляецца, усіх зацікаўленых удзельнікаў (асобаў, якія навучаюцца, бацькоў, працадаўцаў, выкладчыкаў, адміністрацыі ўстановаў адукацыі і прадстаўнікоў улады) за актуальны стан, удасканаленне і развіццё сферы адукацыі».

Дапаўненне:

«1.24. Прафесійная арыентацыя - комплекс мераў, накіраваных на прафесійнае станаўленне пакалення, якое расце, падтрымку і развіццё здольнасцяў і кампетэнцыяў грамадзян, а таксама на садзейнічанне чалавеку ў прафесійным самавызначэнні і выбары аптымальнага віду занятасці з улікам яго патрэбаў, магчымасцяў і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі на рынку працы.

Найважнейшымі напрамкамі прафесійнай арыентацыі з'яўляюцца:

- прафесійная інфармацыя - азнаямленне розных групаў насельніцтва з сучаснымі відамі вытворчасці, станам рынку працы, патрэбамі гаспадарчага комплексу ў кваліфікаваных кадрах, зместам і перспектывамі развіцця рынку прафесій, формамі і ўмовамі іх асваення, патрабаваннямі, што прад'яўляюцца прафесіямі да чалавека, магчымасцямі

прафесійна-кваліфікацыйнага росту і самаўдасканалення ў працэсе працоўнай дзейнасці;

- прафесійная кансультацыя - аказанне дапамогі чалавеку ў прафесійным самавызначэнні з мэтай прыняцця ўсвядомленага рашэння датычна выбару прафесійнага шляху з улікам яго псіхалагічных асаблівасцяў і магчымасцяў, а таксама патрэбаў грамадства;
- прафесійны падбор - наданне рэкамендацыяў чалавеку пра магчымыя накірункі прафесійнай дзейнасці, якія найбольш адпавядаюць яго псіхалагічным, псіхафізіялагічным, фізіялагічным асаблівасцям, на аснове вынікаў псіхалагічнай, псіхафізіялагічнай і медыцынскай дыягностыкі;
- прафесійны адбор - вызначэнне ступені прафесійнай прыдатнасці чалавека да канкрэтнай прафесіі (працоўнага месца, пасады) у адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі;
- прафесійная, вытворчая і сацыяльная адаптацыя - сістэма мераў, якія спрыяюць прафесійнаму станаўленню работніка, фарміраванню ў яго адпаведных сацыяльных і прафесійных якасцяў, установак і патрэбаў да актыўнай творчай працы, дасягненню найвышэйшага ўзроўня прафесіяналізму».

*Артыкул 3. Дзяржаўныя гарантыі правоў у сферы адукацыі*

Сфармуляваць пункт 7.8 у наступнай рэдакцыі:

«стварэннем неабходнай колькасці месцаў у арганізацыях для праходжання практыкі, вытворчага навучання асобаў, якія навучаюцца, а таксама ўключэння кароткага навучання на працоўным месцы ў адукацыйныя праграмы і прысваеннем "дуальных" ступеняў з мэтай камбінавання тэарэтычнай адукацыі ў вышэйшых навучальных установах з прафесійным досведам, атрыманым на працоўным месцы».

Дапоўніць пункт 7:

- пункт 7.11: «наданнем магчымасцяў атрымання адукацыі для падтрымкі або аднаўлення сваіх ведаў, навыкаў і кампетэнцыяў на працягу ўсяго працоўнага жыцця»;

- пункт 7.12: «наданнем права студэнтам на працу да 20 гадзін на тыдзень у перыяд вучобы ва ўстановах вышэйшай адукацыі дзённай формы навучання, пачынаючы з другога года навучання».

*Артыкул 48. Падтрымка выпускнікоў*

Пункт 1 сфармуляваць ў наступнай рэдакцыі:

«1. Падтрымка выпускнікоў - наданне першага працоўнага месца за кошт кватавання працоўных месцаў для выпускнікоў установаў прафесійнай адукацыі ўсіх узроўняў, а таксама ўсталяванне законам гарантый і кампенсацый як выпускнікам, так і працадаўцам, якія прымаюць выпускнікоў установаў прафесійнай адукацыі ўсіх узроўняў;

наданне гарантыяў самазанятасці, захавання працаўладкавання, здольнасці перамяшчацца на рынку працы і магчымасцяў для падтрымкі або аднаўлення сваіх ведаў, навыкаў і кампетэнцыяў на працягу ўсяго працоўнага жыцця».

*Артыкулы 83, 84, 85, 86, 87, 88 скасаваць.*

*Артыкул 113. Прагназаванне развіцця сістэмы адукацыі*

Перафармуляваць назву артыкула наступным чынам: «Маніторынг і прагназаванне сістэмы адукацыі».

Новы пункт 2:

"2. Маніторынг і ацэнка дзейнасці ўстановаў вышэйшай адукацыі праводзяцца з мэтай шматмернай ацэнкі магчымасцяў працаўладкавання выпускнікоў установаў вышэйшай адукацыі і ўключаюць у сябе:

- штогадовыя агляды, якія забяспечваюць спосаб вымярэння адсотка выпускнікоў, кар'ерных траекторый выпускнікоў ВНУ, якія знайшлі працу пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў;
- аналіз якасці працоўных месцаў, атрыманых выпускнікамі адразу і праз 3 гады пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў;
- аналіз тэрміна перыяду пошуку працы выпускнікамі адразу і праз 3 гады пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў;
- апытанні, якія вызначаюць ступень задавальнення выпускнікамі працай адразу і праз 3 гады пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў;
- аналіз, які выяўляе ступень адпаведнасці паміж навыкамі выпускнікоў і навыкамі, запатрабаванымі на працы, і інш.".

Новая рэдакцыя пункта 2 (пункт 3):

"3. Прагнознымі паказчыкамі ў сістэме адукацыі з'яўляюцца сетка ўстановаў адукацыі, кантынгент асобаў, якія навучаюцца, арганізацыя адукацыйнага працэсу, колькасць выпускнікоў, дадзеныя, атрыманыя ў выніку маніторынгу і ацэнкі дзейнасці ўстановаў вышэйшай адукацыі, матэрыяльна-тэхнічная база ўстановаў адукацыі, патрэбы ў педагагічных кадрах, навучальна-метадычных комплексах і іншыя».

*Артыкул 115. Інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі*

Новая рэдакцыя пункта 3:

"3. Інфармацыйнае забеспячэнне ў сферы адукацыі ўключае ў сябе статыстычныя дадзеныя (інфармацыю), дадзеныя ведамаснай справаздачнасці пра вынікі кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі, дадзеныя, атрыманыя ў выніку маніторынгу і ацэнкі дзейнасці ўстановаў

вышэйшай адукацыі (працаўладкаванасць, кар'ерныя траекторыі выпускнікоў і інш.), маніторынгаў, сацыялагічных апытанняў і іншых форм атрымання інфармацыі».

*Артыкул 208. Кіраванне ўстановай вышэйшай адукацыі*

Новая рэдакцыя пункта 9:

«9. У мэтах рэалізацыі прынцыпу сацыяльнага партнёрства ў сферы вышэйшай адукацыі і ўліку інтарэсаў асобаў, якія навучаюцца, працадаўцаў, бацькоў (законных прадстаўнікоў) непаўналетніх асобаў, якія навучаюцца, і педагагічных работнікаў па пытаннях кіравання адукацыйнай арганізацыяй і пры прыняцці адукацыйнай арганізацыяй лакальных нарматыўных актаў, якія закранаюць іх правы і законныя інтарэсы, па ініцыятыве асобаў, якія навучаюцца, працадаўцаў, бацькоў (законных прадстаўнікоў) непаўналетніх асобаў, якія навучаюцца, і педагагічных работнікаў у адукацыйнай арганізацыі:

1) ствараюцца рады асобаў, якія навучаюцца (у прафесійнай адукацыйнай арганізацыі і адукацыйнай арганізацыі вышэйшай адукацыі - студэнцкія рады), рады бацькоў (законных прадстаўнікоў) непаўналетніх асобаў, якія навучаюцца, або іншыя органы (далей - рады асобаў, якія навучаюцца, рады бацькоў);

2) ствараюцца апякунскія рады з удзелам працадаўцаў;

3) дзейнічаюць прафесійныя саюзы асобаў, якія навучаюцца і (або) работнікаў адукацыйнай арганізацыі (далей - прадстаўнічыя органы асобаў, якія навучаюцца, прадстаўнічыя органы работнікаў)».

*Глава 11. Кіраванне ў сферы адукацыі*

Дапоўніць главу артыкулам «Кампетэнцыі Апякунскіх радаў працадаўцаў у сферы адукацыі» наступнага зместу:

«Апякунскія рады працадаўцаў у сферы адукацыі:

- удзельнічаюць у прыняцці рашэнняў органамі кіравання вышэйшых навучальных установаў з мэтай садзейнічання вырашэнню бягучых і перспектыўных задачаў развіцця вышэйшай навучальнай установы;
- садзейнічаюць прыцягненню фінансавых і матэрыяльных сродкаў для забеспячэння дзейнасці і развіцця вышэйшай навучальнай установы, а таксама для ажыццяўлення кантролю за выкарыстаннем такіх сродкаў;
- садзейнічаюць удасканаленню матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшай навучальнай установы;
- удзельнічаюць у распрацоўцы адукацыйных праграм вышэйшай і паслявузаўскай прафесійнай адукацыі, якія рэалізуюцца вышэйшай навучальнай установай для забеспячэння ўліку ў гэтых праграмах патрабаванняў зацікаўленых працадаўцаў да выканання выпускнікамі працоўных функцыяў;
- удзельнічаюць у распрацоўцы праграм і праектаў каапераці ўніверсітэта і бізнэсу».

Дапоўніць *раздзел XI* новай главой «*Прафесійная арыентацыя ва ўстановах вышэйшай адукацыі*» наступнага зместу:

1. Прафесійная арыентацыя ва ўстановах вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца з мэтай:

- забеспячэння сацыяльных гарантыяў у сферы свабоднага выбару прафесіі, формы занятасці і шляхоў самарэалізацыі асобы ва ўмовах рынкавых адносін;
- дасягнення збалансаванасці паміж прафесійнымі інтарэсамі чалавека, яго псіхафізіялагічнымі асаблівасцямі і магчымасцямі рынку працы;
- прагназавання прафесійнай паспяховасці ў адвольнай сферы працоўнай дзейнасці;
- садзейнічання неперарыўнаму росту прафесіяналізму асобы як найважнейшай умовы яго/яе задаволенасці працай і ўласным сацыяльным статусам, рэалізацыі індывідуальнага патэнцыялу, фарміравання здаровага ладу жыцця і годнага дабрабыту.

Адукацыйныя ўстановы вышэйшай адукацыі:

- забяспечваюць прафарыентацыйную накіраванасць навучальных праграм, дапаможнікаў і навучальна-выхаваўчага працэсу ў цэлым, удзел у гэтай працы педагагічных калектываў, працадаўцаў, бацькоўскай грамадскасці, спецыялістаў адпаведных арганізацыяў і ўстановаў;
- праводзяць сістэмную, кваліфікаваную і комплексную прафарыентацыйную працу;
- фарміруюць у навучэнцаў агульнаадукацыйных установаў свядомы падыход да выбару прафесіі ў адпаведнасці з інтарэсамі, станам здароўя і асаблівасцямі кожнага навучэнца з улікам патрэбаў рэгіёну ў кадрах;
- залучаюць навучэнцаў у вольны час у тэхнічную і мастацкую творчасць, павышаюць яе ролю ў выбары прафесіі;
- арганізуюць прафесійную асвету і кансультаванне навучэнцаў, фарміруюць у іх прафесійныя намеры на падставе комплекснага вывучэння асобы з улікам іх індывідуальных псіхафізіялагічных асаблівасцяў, стану здароўя, а таксама патрэбаў рэгіёну ў кадрах;
- арганізуюць дыферэнцыяванае навучанне для больш поўнага раскрыцця індывідуальных інтарэсаў навучэнцаў, іх здольнасцяў і схільнасцяў;
- забяспечваюць арганічнае адзінства псіхолага-педагагічнай і медыцынскай кансультацыі, прафесійнага адбору (падбору) моладзі, якая паступае ў вышэйшую адукацыйную ўстанову;
- выкарыстоўваюць магчымасці псіхалагічных службаў, якія фарміруюцца ў адукацыйных установах, для арганізацыі і правядзення прафарыентацыйнай працы.

Гарантаваны мінімум псіхолага-прафарыентацыйных паслуг.

Гарантаваны мінімум бясплатных псіхолага-прафарыентацыйных паслуг уключае ў сябе:

- прапанаванне прафесійнай інфармацыі ўсім тым, хто звярнуўся за такой, незалежна ад спецыяльнасці, полу, узросту і іншых фактараў;
- правядзенне для асобаў, якія навучаюцца ва ўстановах вышэйшай адукацыі, групавых прафкансультацый, а таксама заняткаў па псіхалагічным кансультаванні і суправаджэнні прафесійнага выбару;
- аказанне індывідуальнай псіхолага-прафарыентацыйнай дапамогі студэнтам і выпускнікам (у першыя тры гады працоўнай дзейнасці), асобам з абмежаванай

працаздольнасцю, непрэзентатыўна прадстаўленым групам і студэнтам з абмежаванымі магчымасцямі.

4. Дадатковы пералік псіхолага-прафарыентацыйных паслуг, якія прапануюцца бясплатна або на льготных умовах, можа ўсталёўвацца ўстановамі вышэйшай адукацыі з улікам умоваў і магчымасцяў гэтай установы.

5. Прафесійная дзейнасць у галіне прафесійнай арыентацыі і псіхалагічнай падтрымкі насельніцтва.

Да працы ў галіне прафесійнага кансультавання, прафесійнага адбору (падбору), псіхадыягностыкі і карэкцыі дапускаюцца толькі асобы, якія маюць адпаведную адукацыю і прайшлі атэстацыю ва ўстаноўленым парадку».

## 5. Рэкамендацыі па выкананні палажэнняў Дарожнай карты, накіраваных на забеспячэнне выканання фундаментальных акадэмічных каштоўнасцяў

У частцы фундаментальных акадэмічных каштоўнасцяў абавязкі беларускага боку ў Дарожнай карце рэфармавання вышэйшай адукацыі складаюцца ў ажыццяўленні да сярэдзіны 2017 г. аналізу нацыянальнага заканадаўства і прадстаўленні парламенту прапановаў па ўключэнні ў заканадаўства прынцыпаў Вялікай хартыі ўніверсітэтаў і рэкамендацыяў Рады Еўропы Rec/CM(2012)7 у дачыненні да адказнасці дзяржавы за забеспячэнне акадэмічнай свабоды і інстытуцыйнай аўтаноміі.

Акрамя таго, да сярэдзіны 2016 г. запланавана распрацоўка плана заканадаўчых мераў і мераў адукацыйнай палітыкі, накіраваных на забеспячэнне правоў студэнтаў і выкладчыкаў на свабоднае стварэнне арганізацыяў і іх рэгістрацыю.

Імплементацыя ў заканадаўства асноўных прынцыпаў Magna Charta Universitatum прадугледжвае забеспячэнне:

- незалежнасці ўніверсітэтаў ад палітычнай і эканамічнай улады;
- непадзельнасці навучальнага працэсу ва ўніверсітэтах і даследчай дзейнасці;
- свабоды выкладання, даследаванняў і навучання;
- узаемнага пазнання і ўзаемадзеяння разнастайных культур.

Належны ўзровень інстытуцыйнай аўтаноміі беларускіх ВНУ можа быць забяспечаны імплементацыяй у заканадаўства рэкамендацыяў Рады Еўропы Rec /CM(2012)7 у дачыненні да адказнасці дзяржавы за забеспячэнне акадэмічнай свабоды і інстытуцыйнай аўтаноміі.

Прапановы Мінадукацыі па змяненні заканадаўства павінныя ўключаць наступныя палажэнні.

1. Гарантыі правоў інстытуцыяў і індывідаў на абарону ад вонкавага ўмяшальніцтва з боку ўладаў і інш. Персаналу і студэнтам павінна быць забяспечана свабода вучыць, вучыцца і даследаваць без страху дысцыплінарных мераў, звальнення ці іншых формаў пакарання.

2. Замацаванне ў заканадаўстве інстытуцыйнай аўтаноміі ў поўным аб'ёме: арганізацыйнай, фінансавай, кадравай і акадэмічнай.

3. Замацаванне ў заканадаўстве механізму пастаяннага маніторынгу імплементацыі фундаментальных каштоўнасцяў.

4. Замацаванне ў законе механізму дыялогу і раўнапраўнага партнёрства УВО і органаў дзяржаўнай улады ў распрацоўцы стратэгіяў развіцця вышэйшай адукацыі. Рэкамендацыйны характар прапановаў дзяржорганаў адносна такіх стратэгіяў. Права кіраўніцтва УВО самастойна вызначаць місію і прыярытэты УВО.

5. Забарона на абмежаванне акадэмічнай свабоды персаналу УВО спасылкамі на статус дзяржслужачых або падобны статус.

6. Замацаванне ў заканадаўстве калегіяльных формаў кіравання УВО. Пераразмеркаванне паўнамоцтваў на карысць калегіяльных органаў кіравання УВО.

7. Замацаванне ў заканадаўстве норм, якія падтрымліваюць прыцягненне сродкаў з недзяржаўных крыніц для фінансавання УВО (падатковыя ільготы і інш.).

8. Замацаванне ў заканадаўстве права УВО самастойна распараджацца фінансавымі сродкамі незалежна ад іх крыніцы і ў адпаведнасці з мэтамі, усталяванымі калегіяльнымі органамі кіравання УВО.

10. Абавязковае распаўсюджванне ўсіх гэтых норм на ўсе УВО незалежна ад формы ўласнасці.

11. Заканадаўчае замацаванне абавязкаў дзяржаўных органаў заахвочваць ажыццяўленне міжнароднай палітыкі, якая патрабуе інстытуцыйнай аўтаноміі і акадэмічнай свабоды.

У мэтах выканання палажэнняў Дарожнай карты, накіраваных на забеспячэнне выканання фундаментальных акадэмічных каштоўнасцяў, прапануецца ўнесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі наступныя змяненні і дапаўненні.

Пункт 25.2 дапоўніць наступным палажэннем:

«Кіраўнік установы вышэйшай адукацыі абіраецца на пасаду і вызваляецца ад пасады ў парадку, які ўсталёўваецца дадзеным Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі і статутам установы адукацыі».

Пункт 25.4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Кампетэнцыя, парадак фарміравання, склад і арганізацыя дзейнасці органаў самакіравання ўсталёўваюцца ў адпаведнасці з дадзеным Кодэксам і статутам установы адукацыі».

Главу 33 (38) дапоўніць артыкулам $191^1$ ($207^1$) «Аўтаномія ўстановы вышэйшай адукацыі. Акадэмічная свабода» наступнага зместу:

«Установы вышэйшай адукацыі, незалежна ад формы ўласнасці, валодаюць інстытуцыйнай аўтаноміяй, якая ўключае заснаваныя на прынцыпе самакіравання і акадэмічнай свабоды правы:

- абіраць органы самакіравання ў адпаведнасці са статутам установы вышэйшай адукацыі;
- самастойна ўсталёўваць арганізацыйную структуру ўстановы, правілы працоўнага і ўнутранага распарадку;
- вызначаць кадравую палітыку, умовы аплаты працы;
- адкрываць новыя адукацыйныя праграмы, зацвярджаць навучальныя планы, планы навуковых даследаванняў і творчай працы;
- выдаваць навуковую і навучальную літаратуру;
- самастойна ўсталёўваць план прыёму на адукацыйныя праграмы;
- залічваць і адлічваць студэнтаў, слухачоў, аспірантаў і дактарантаў;

- у адпаведнасці з законам валодаць, карыстацца і распараджацца нерухомасцю, іншай маёмасцю ўстановы вышэйшай адукацыі;
- самастойна выкарыстоўваць фінансавыя рэсурсы;
- прыцягваць на ўмовах платнасці і зваротнасці пазыковыя сродкі;
- усталёўваць памер аплаты адукацыйных паслуг;
- ствараць для рэалізацыі статутных мэтаў структурныя падпадзяленні са статусам юрыдычнай асобы;
- прысвойваць акадэмічныя і навуковыя ступені і званні, прысвойваць ганаровыя званні.

Прафесарска-выкладчыцкі склад, навуковыя супрацоўнікі і студэнты ўстановы вышэйшай адукацыі маюць права на:

- свабоду выкладання і навучання;
- свабоднае выказванне сваіх поглядаў;
- свабоду творчасці і даследаванняў;
- удзел у асацыяцыях, саюзах і іншых аб'яднаннях;
- свабоду перамяшчэння і прафесійных зносін;
- удзел у кіраванні ўстановай адукацыі;
- свабоду ад дыскрымінацыі па палітычных, расавых, палавых матывах, а таксама ў сувязі з прыхільнасцю да непрызнаных навуковых поглядаў.

Гэтыя правы гарантуюцца законам і замацоўваюцца ў статуце ўстановы адукацыі».

Артыкул 192 (208) «Кіраванне ўстановай вышэйшай адукацыі» выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Галоўнымі кіраўнічымі органамі ўстановы вышэйшай адукацыі з'яўляюцца: рада (сенат) установы вышэйшай адукацыі, кіраўнічая рада, рэктарат і рэктар.

2. Кіраўнічая рада.

2.1. Асноўнымі функцыямі кіраўнічай рады з'яўляюцца:

выбар рэктара з трох кандыдатураў, прапанаваных сенатам;

вызваленне рэктара, прарэктараў ад пасады па прапанове рады;

вызваленне ад пасады старэйшага адміністрацыйнага персаналу па прапанове рады (сената);

абвяшчэнне выбараў рэктара;

распрацоўка правіл правядзення выбараў;

выбары прарэктараў па прапанове рэктара;

зацвярджэнне або ўхваленне стварэння юрыдычных асобаў і парадку кіравання імі;

зацвярджэнне плана развіцця;

зацвярджэнне правіл фарміравання і працы рэктарата;

зацвярджэнне бюджэта, прадстаўленага рэктаратам;

усталяванне памеру аплаты адукацыйных паслуг;

усталяванне ўмоваў і парадку аплаты працы адміністрацыйнага, прафесарска-выкладчыцкага, навуковага і дапаможнага персаналу;

прызначэнне аўдытара і інфармаванне заснавальніка пра парушэнні, якія дапускаюцца кіраўніцтвам установы адукацыі, або пагрозы фінансавых рызык;

заключэнне працоўнай дамовы з рэктарам.

2.2. Кіраўнічая рада складаецца з няцотнай колькасці членаў (3, 5, 7, 9), з якіх 1, 2, 3, 4 прызначаюцца пароўну радай (сенатам) установы вышэйшай адукацыі і заснавальнікам, а адзін дадатковы член - узгодненым рашэннем абодвух бакоў.

Члены рады не могуць быць дзяржаўнымі службоўцамі любога ўзроўню, кіраўнікамі палітычных партыяў або супрацоўнікамі дадзенай установы вышэйшай адукацыі.

Любыя дзелавыя зносіны членаў кіраўнічай рады з установай вышэйшай адукацыі патрабуюць ухвалення кіраўнічай рады.

Члены кіраўнічай рады павінныя з'яўляцца аўтарытэтнымі і адказнымі прадстаўнікамі акадэмічных, культурных або дзелавых колаў і валодаць дастатковай кампетэнтнасцю для выканання функцыяў у радзе. Члены рады маюць права атрымання любой інфармацыі аб заснаванні вышэйшай адукацыі.

3. Рада (сенат).

3.1. Рада (сенат) установы вышэйшай адукацыі выконвае наступныя функцыі:

прымае статут і робіць у ім змяненні;

зацвярджае планы развіцця і падае іх кіраўнічай радзе;

зацвярджае і змяняе склад кіраўнічай рады і ўдзельнічае ў яго фармаванні;

зацвярджае абвяшчэнне пра выбары рэктара, пададзенае кіраўнічай радай;

выказвае меркаванне пра кандыдатуры прарэктараў для кіраўнічай рады;

фармуе спіс з трох кандыдатаў на пасаду рэктара для кіраўнічай рады;

удзельнічае ў працэдуры вызвалення ад пасады рэктара, прарэктараў, членаў кіраўнічай рады;

праводзіць выбары на пасады дэканаў, дырэктараў інстытутаў, іншых навуковых падпадзяленняў, загадчыкаў кафедрамі, прафесараў, дацэнтаў, на іншыя пасады прафесарска-выкладчыцкага складу, усталёўвае правілы і працэдуры выбараў і вызвалення ад пасадаў калегіяльнымі органамі структурных падпадзяленняў установы вышэйшай адукацыі, правілы замяшчэння іншых пасадаў;

прымае рашэнні аб змяненні структуры навуковых і навучальных падпадзяленняў;

зацвярджае планы навуковых даследаванняў і распрацовак, творчых прац і г.д .;

вызначае стратэгію і перспектывы развіцця адукацыйнай, навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ўстановы вышэйшай адукацыі;

зацвярджае асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў і інавацыйнай дзейнасці;

зацвярджае і робіць змяненні ў навучальных планах;

усталёўвае план і правілы прыёму студэнтаў;

прысуджае навуковыя ступені і званні, ганаровыя навуковыя ступені і званні;

разглядае апеляцыі на рашэнні адміністрацыі;

фарміруе камісію па вырашэнні спрэчак;

стварае і ўсталёўвае парадак працы камісій і працоўных групаў;

прымае рашэнне аб адкрыцці новых адукацыйных праграм (спецыяльнасцяў).

3.2. У склад рады (сената) уваходзяць прафесары, уключаючы і кіраўнікоў навучальных і навуковых падпадзяленняў, іншыя катэгорыі прафесарска-выкладчыцкага складу і навуковых работнікаў, студэнты, неакадэмічны персанал, прадстаўнікі прафсаюзаў педагагічных работнікаў, прадстаўнікі аб'яднанняў працадаўцаў і сацыяльных партнёраў.

3.3. Парадак фарміравання рады (сената) усталёўваецца статутам.

3.4. Рэктар з'яўляецца членам рады (сената) адпаведна пасадзе.

3.5. Для рады ў статуце ўсталёўваюцца абмежаванні па колькасці тэрмінаў знаходжання на пасадзе.

3.6. Старшыня кіраўнічай рады і рады (сената) абіраецца з членаў адпаведнага органа кіравання і вызваляецца ад пасады простай большасцю галасоў.

3.7. Рэктар не мае права ўзначальваць раду (сенат).

4. Рэктарат.

4.1. Паўнамоцтвы і функцыі рэктарата ўсталёўваюцца статутам.

5. Кіраўнік (рэктар).

5.1. Кіраўнік (рэктар) установы вышэйшай адукацыі абіраецца на пасаду і вызваляецца ад пасады калегіяльна (выбарным) органам (кіраўнічай радай) у парадку, які вызначаецца дадзеным Кодэксам і статутам установы вышэйшай адукацыі.

5.2. Рэктар абіраецца на пяцігадовы тэрмін і можа знаходзіцца на пасадзе не больш за два тэрміны.

5.3. Рэктар можа быць вызвалены ад пасады датэрмінова за парушэнне службовых абавязкаў, страту даверу з боку акадэмічнай супольнасці, у выпадку няздольнасці выконваць свае абавязкі па стане здароўя або па прысудзе суда.

5.4. Рэктар.

5.4.1. ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва ўстановай вышэйшай адукацыі;

5.4.2. у сваёй дзейнасці падсправаздачны кіраўнічай радзе і радзе (сенату) установы вышэйшай адукацыі;

5.4.3. прадстаўляе ўстанову вышэйшай адукацыі без даверанасці;

5.4.4. выдае загады, заключае дамовы, выдае даверанасці, адкрывае рахункі ў банках у межах сваёй кампетэнцыі;

5.4.5. арганізуе навуковую, навукова-тэхнічную, адукацыйную, выхаваўчую, метадычную, творчую і фінансава-гаспадарчую дзейнасць установы;

5.4.6. ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў, зацвярджае іх службовыя інструкцыі;

5.4.7. заключае кантракты з работнікамі ўстановы ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках;

5.4.8. арганізуе навучальны і выхаваўчы працэс;

5.4.9. арганізуе працу рэктарата;

5.4.10. распрацоўвае і прадстаўляе на зацвярджэнне кіраўнічай радзе бюджэт установы вышэйшай адукацыі;

5.4.11. распрацоўвае і прадстаўляе на зацвярджэнне радзе (сенату) планы развіцця ўстановы вышэйшай адукацыі;

5.4.12. распрацоўвае і прадстаўляе на зацвярджэнне радзе (сенату) планы і справаздачы пра навуковыя даследаванні і распрацоўкі, планы і справаздачы пра творчыя працы;

5.4.13. арганізуе прафарыентацыйную працу;

5.4.14. арганізуе практыкі;

5.4.15. плануе і арганізуе павышэнне кваліфікацыі работнікаў установы;

5.4.16. арганізуе працу па садзейнічанні працаўладкаванню выпускнікоў;

5.4.17. узначальвае прыёмную камісію ўстановы;

5.4.16. выконвае іншыя функцыі, усталяваныя статутам установы вышэйшай адукацыі.

6. Дырэктары інстытутаў, дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедраў, кіраўнікі навучальных і навуковых падпадзяленняў, прафесарска-выкладчыцкі склад прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады рэктарам на падставе рашэння рады (сената) або яго структурнага падпадзялення.

Рэктар не мае права мяняць тэрмін і ўмовы кантракта з такімі работнікамі, акрамя выпадкаў, прадугледжаных законам і статутам.

7. У адпаведнасці са статутам установы вышэйшай адукацыі ў ёй могуць стварацца апякунская рада і іншыя органы самакіравання, падсправаздачныя радзе (сенату), для рашэння праблем у пэўных напрамках дзейнасці ўстановы.

8. Кіраўнічая рада і рада (сенат) могуць ствараць пастаянныя камісіі і часовыя экспертныя і працоўныя групы для вывучэння асобных праблем і выпрацоўкі праектаў рашэнняў па іх».

Дапоўніць артыкул 137 пунктамі 4, 5, 6 наступнага зместу:

"4. Дзейнасць установы адукацыі фінансуецца яе заснавальнікам у адпаведнасці з доўгатэрміновай дамовай паміж імі. Бюджэтны перыяд не павінен складаць менш за тры гады. Па дамове паміж заснавальнікам і адукацыйнай установай апошняя можа функцыянаваць на ўмовах самафінансавання.

5. Дзяржаўныя ўстановы адукацыі самастойна вызначаюць напрамкі і парадак выкарыстання сваіх бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў, у тым ліку іх долю, якая накіроўваецца на аплату працы і матэрыяльнае стымуляванне работнікаў установаў адукацыі.

6. Установы вышэйшай адукацыі могуць самастойна выкарыстоўваць рэшткі бюджэтных сродкаў і пераводзіць іх з бюджэту бягучага года ў бюджэт наступнага. Яны таксама маюць

права выкарыстоўваць прыцягнутыя сродкі, у тым ліку крэдыты, атрыманыя ад банкаў, фінансавых кампаній, асобных фондаў на ўмовах зваротнасці і платнасці.

7. Прыватныя ўстановы адукацыі атрымліваюць права на дзяржаўнае фінансаванне або фінансаванне з мясцовага бюджэту з моманту іх дзяржаўнай акрэдытацыі ў выпадку рэалізацыі імі асноўных агульнаадукацыйных праграм або праграм іншых узроўняў адукацыі на конкурснай аснове».

Дапоўніць артыкул 139 пунктамі 8, 9, 10, 11 наступнага зместу:

«8. Установе вышэйшай адукацыі належыць права ўласнасці на грашовыя сродкі, маёмасць і іншыя аб'екты ўласнасці, уключаючы будынкі і іншыя аб'екты нерухомасці, перададзеныя ёй фізічнымі і/або юрыдычнымі асобамі ў форме дару, ахвяравання, па завяшчанні або іншым законным спосабам, на прадукты інтэлектуальнай і творчай працы, якія з'яўляюцца вынікам яе дзейнасці, а таксама на даходы ад уласнай дзейнасці адукацыйнай установы і набытыя на гэтыя даходы аб'екты ўласнасці.

9. Адчужэнне ўласнасці ўстановай вышэйшай адукацыі магчыма толькі з мэтай забеспячэння статутных мэтаў і са згоды калегіяльных органаў кіравання ўстановы вышэйшай адукацыі.

10. Установа адукацыі адказвае па сваіх абавязках, якія знаходзяцца ў яе распараджэнні, грашовымі сродкамі і іншай маёмасцю, уласнікам якой яна з'яўляецца. Пры недастатковасці ў адукацыйнай установы названых сродкаў адказнасць па яе абавязках нясе ўласнік маёмасці, замацаванай за адукацыйнай установай, у парадку, што вызначаецца законам.

11. Пры ліквідацыі ўстановы адукацыі грашовыя сродкі і іншыя аб'екты ўласнасці, якія належаць ёй па праве ўласнасці, за вылікам плацяжоў па пакрыцці сваіх абавязкаў, накіроўваюцца на мэты развіцця адукацыі ў адпаведнасці са статутам адукацыйнай установы».

Главу 33 (38) дапоўніць артыкулам $192^1$ ($208^1$) «Студэнцкае самакіраванне і ўдзел студэнтаў у кіраванні ўстановай вышэйшай адукацыі» наступнага зместу:

«1. Ва ўстановах вышэйшай адукацыі і іх структурных падпадзяленнях студэнты і аспіранты маюць права на самакіраванне і стварэнне розных органаў самакіравання. Усе студэнты і аспіранты маюць роўныя правы на ўдзел у органах самакіравання, якія абіраюцца шляхам таемнага галасавання.

2. Студэнцкае самакіраванне забяспечвае абарону правоў і інтарэсаў асобаў, якія навучаюцца ва ўстанове вышэйшай адукацыі, і іх удзел у кіраванні ўстановай вышэйшай адукацыі.

Вышэйшым органам студэнцкага самакіравання з'яўляецца канферэнцыя асобаў, якія навучаюцца ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Канферэнцыя прымае статут, робіць у ім змяненні, абірае органы студэнцкага самакіравання, прымае рашэнні па справаздачы выканаўчых органаў студэнцкага самакіравання, абірае прадстаўнікоў у раду (сенат), іншыя органы кіравання і самакіравання ўстановы вышэйшай адукацыі.

Умяшальніцтва кіраўніцтва ўстановы вышэйшай адукацыі або іншых адміністрацыйных органаў у працэс прыняцця рашэння канферэнцыяй і органамі студэнцкага самакіравання не дапускаецца.

3. Паўнамоцтвы органаў студэнцкага самакіравання ў вырашэнні пытанняў, якія закранаюць правы і інтарэсы асобаў, якія навучаюцца ва ўстанове вышэйшай адукацыі, усталёўваюцца па

пагадненні паміж радай (сенатам) і органамі студэнцкага самакіравання і замацоўваюцца ў статуце ўстановы вышэйшай адукацыі.

Рада (сенат) установы вышэйшай адукацыі не менш за 25% павінна складацца з прадстаўнікоў студэнцкага самакіравання, абраных таемным галасаваннем на канферэнцыі асобаў, якія навучаюцца ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

4. Органы студэнцкага самакіравання могуць мець форму юрыдычных асобаў, весці гаспадарчую дзейнасць, прыцягваць сродкі спонсараў на статутныя мэты.

Для мэтаў фінансавання студэнцкага самакіравання ў распараджэнне органаў студэнцкага самакіравання з бюджэта ўстановы вышэйшай адукацыі штогод павінныя выдзяляцца фінансавыя рэсурсы ў памеры, усталяваным пагадненнем паміж органамі студэнцкага самакіравання і радай (сенатам) установы вышэйшай адукацыі.

Кіраўнік установы вышэйшай адукацыі абавязаны забяспечваць належныя ўмовы для дзейнасці органаў студэнцкага самакіравання і прапаноўваць памяшканне, мэблю, аргтэхніку, сувязь і асобную старонку на вэб-сайце ўстановы вышэйшай адукацыі.

5. У Рэспубліцы Беларусь могуць стварацца гарадскія, рэгіянальныя (абласныя) і нацыянальны студэнцкія саюзы.

6. Прадстаўнікі студэнцкага самакіравання ўсіх установаў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, абраныя таемным галасаваннем на канферэнцыях установаў вышэйшай адукацыі, утвараюць раду Нацыянальнага студэнцкага саюза. Рада прымае статут Саюза, робіць у ім змяненні, абірае выканаўчыя органы Нацыянальнага студэнцкага саюза, прымае рашэнні па справаздачы выканаўчых органаў, абірае прадстаўнікоў у грамадскую раду Міністэрства адукацыі.

7. Прадстаўнікі студэнцкага самакіравання горада, вобласці, абраныя таемным галасаваннем на адпаведных канферэнцыях, утвараюць Студэнцкую раду горада, вобласці. Рада прымае статут, робіць у ім змяненні, абірае выканаўчыя органы, прымае рашэнні па іх справаздачы».

Артыкул 115 дапоўніць наступным палажэннем:

«Маніторынг сістэмы адукацыі ўяўляе сабой сістэматычнае стандартызаванае назіранне за станам адукацыі і дынамікай змяненняў яго вынікаў, умовамі ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці, кантынгентам асобаў, якія навучаюцца, навучальнымі і пазанавучальнымі дасягненнямі асобаў, якія навучаюцца, прафесійнымі дасягненнямі выпускнікоў арганізацыяў, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, станам сеткі арганізацыяў, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, узроўнем інтэрнацыяналізацыі ўстановаў адукацыі, выкананнем імі фундаментальных акадэмічных правоў удзельнікаў адукацыйнага працэсу (акадэмічнай свабоды) і інстытуцыйнай аўтаноміі.

Неад'емнай часткай маніторынгу сістэмы адукацыі з'яўляюцца штогадовыя апытанні выпускнікоў установаў вышэйшай адукацыі пра ацэньванне імі якасці атрыманай адукацыі. Апытанні праводзяцца незалежнай даследчай арганізацыяй, абранай на конкурснай аснове, і фінансуюцца са сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

Парадак ажыццяўлення маніторынгу сістэмы адукацыі, а таксама пералік абавязковай інфармацыі, якая падлягае маніторынгу, усталёўваецца Урадам.

Аналіз стану і перспектываў развіцця адукацыі па выніках маніторынгу падлягае штогадоваму апублікаванню ў выглядзе выніковых (гадавых) справаздачаў і размяшчэнні ў сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце Міністэрства адукацыі».

Артыкул 46 сфармуляваць наступным чынам:

«Студэнты або іх законныя прадстаўнікі маюць права на атрыманне льготнага крэдыта, адпаведнага рэальным нарматыўным выдаткам, на атрыманне платнай адукацыі адпаведнага ўзроўню. Вяртанне крэдыта не павінна пачынацца раней за два гады пасля завяршэння навучання».